# XI. ПОТРЕБИТЕЛЬСКАЯ КООПЕРАЦИЯ: ТЕОРИЯ, ИСТОРИЯ, ПРАКТИКА

УДК 334.735(091)

***У. А. Аксёнаў*** (Akcenov392@mail.com),
*студэнт*

***А. М. Аксёнаў*** (bodnanv@mail.ru),
*канд. гіст. навук, дацэнт*
*Беларускі гандлёва-эканамічны*
*ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі*
*г. Гомель, Рэспубліка Беларусь*

## ПЕРШЫЯ САЮЗЫ СПАЖЫВЕЦКІХ ТАВАРЫСТВАЎ НА ЭТНІЧНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ: ЧАС І АСАБЛІВАСЦІ СТВАРЭННЯ

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці ўзнікнення першых саюзаў спажывецкіх таварыстваў на тэрыторыі Беларусі ва ўмовах Першай сусветнай вайны і рэвалюцыйных падзей першай чвэрці XX ст. Асаблівая ўвага надаецца дыскусійным пытанням па ацэнцы развіцця кааператыўнага будаўніцтва ў згадваемы перыяд.

This article examines the emergence of the first cooperative associations in Belarus during the First World War and the revolutionary events of the first quarter of the 20th century. Particular attention is paid to controversial issues in assessing the development of cooperative development during this period.

*Ключавыя словы*: кааператыўнае таварыства; саюзы кааператараў; Першая сусветная вайна; рэвалюцыя; Цэнтрабелсаюз.

*Key words*: cooperative association; cooperative associations; First World War; revolution; Central Belarusian Union.

Пытанні актыўнага распаўсюджвання кааператыўнай ідэалогіі на этнічнай тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. і звязаны з гэтым працэсам хуткі рост колькасці кааператываў спажыўцоў і членаў-пайшчыкаў у іх дастаткова поўна разгледжаны ў беларускай гістарыяграфіі вучонымі-эканамістамі, гісторыкамі [1–8]. Даступныя даследчыкам крыніцы ў асноўным прааналізаваны, зроблены абагульненні і высновы. Агульная карціна кааператыўнага будаўніцтва на беларускай зямлі ў першай чвэрці XX ст. у цэлым адлюстравана. Белыя плямы, прабелы ў ёй таксама ў асноўным пазначаны [9]. Аднак застаюцца некаторыя аспекты гісторыі кааператыўнага будаўніцтва ў беларускім рэгіёне перыяду Першай сусветнай вайны і першых гадоў савецкай эпохі, прыкладна 1914–1920 гг., вакол якіх працягваецца навуковая дыскусія вучоных і кааператараў-практыкаў. Так, напрыклад, ветэран беларускай спажывецкай кааперацыі В. В. Кавальчук мяркуе, што першым самым буйным саюзам на тэрыторыі Беларусі быў не Мінскі саюз, створаны 22 чэрвеня 1917 г., ад даты стварэння якога прынята весці адлік існавання адзінага агульнабеларускага цэнтра кааператыўнага руху – Белкаапсаюза. У сваіх публікацыях В. В. Кавальчук прыводзіць довады, што крыху раней такі буйны цэнтр ужо ўзнік у Гомелі [10]. Тады было б лагічна перанесці дату ўзнікнення цэнтра саюзнага кааператыўнага будаўніцтва на беларускай зямлі на ранейшы тэрмін і лічыць месцам яго “нараджэння” не Мінск, а Гомель.

У артыкуле аналізуецца, з пункту гледжання храналогіі, працэс стварэння саюзаў спажыўцоў на беларускай зямлі. Метадалагічна правільна будзе разглядаць падзеі кааператыўнага будаўніцтва, па-першае, на ўсёй тэрыторыі этнічнай Беларусі. Расія да рэвалюцый 1917 г. была унітарнай шматнацыянальнай дзяржавай, у якой пражывалі і беларусы. Існуе прызнаная вучонай супольнасцю карта рассялення беларусаў на пачатак XX ст., складзеная акадэмікам Я. Ф. Карскім (1903 г.), прафесарам М. В. Доўнар-Запольскім (1919 г.), іншымі вядомымі этнографамі таго часу. У савецкі перыяд XX ст., пасля ўзнікнення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці (Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь, Беларуская Савецкая Сацыяліс-

тычная Рэспубліка (БССР), палітычныя і этнічныя межы беларусаў не будуць супадаць. На момант стварэння кааператыўных саюзаў на беларускай зямлі, у 1914–1918 гг., беларуская нацыя, якая завяршала сваё фармаванне, яшчэ не мела ўласнай дзяржаўнасці. Лагічна ў такіх умовах разглядаць працэс аб'яднання таварыстваў спажыўцоў у кааператыўныя саюзы ў этнічных межах беларусаў перыяду Расійскай імперыі. Першыя саюзы кааператараў на беларускіх землях складаюцца ў гады Першай сусветнай вайны. У гэты час беларуская тэрыторыя Расіі была падзелена на дзве часткі расійска-германскім Заходнім фронтам – галоўным "шчытом" Расіі, самым магутным і насычаным войскамі – з паўтара мільёнамі салдат. Ён праходзіў з кастрычніка 1915 г. да завяршэння вайны па лініі Дзвінск – Паставы – Смаргонь – Баранавічы – Пінск.

Падзеі гэтага перыяду, звязаныя з аб'яднаннем кааператываў спажыўцоў у саюзы, якія адбываліся на незанятай ворагам беларускай тэрыторыі, гісторыкамі дастаткова падрабязна вывучаны. Аднак поўнай карціны аналагічных працэсаў на беларускай тэрыторыі, занятай войскамі кайзераўскай Германіі перыяду 1914–1918 гг., пакуль няма. Можна меркаваць, што спробы аб'яднання асобных кааператыўных таварыстваў у саюзы там вялікага поспеху не мелі з улікам ваенна-палітычнага становішча. Праблему кааператыўнага будаўніцтва ў разглядаемы перыяд на этнічнай тэрыторыі беларусаў, якая не ўвайшла ў склад БССР (Смаленшчына, усходняя частка Браншчыны, беларускія раёны Пскоўшчыны), для беларускіх гісторыкаў можна назваць недаследаванай. Першыя кааператывы гэтага рэгіёна больш імкнуліся да агульнарасійскага кааператыўнага цэнтра ў Маскве (Маскоўскі саюз спажывецкіх таварыстваў створаны ў 1898 г.). З кааператарамі Гомельшчыны, Віцебшчыны, Магілёўшчыны яны наладжвалі не саюзныя адносіны, а пераважна партнёрскія, эканамічнага характару. Названая вышэй праблема яшчэ чакае сваіх даследчыкаў.

Пры аналізе працэсаў кааператыўнага будаўніцтва ў разглядаемы перыяд важна ўлічваць колькасныя і якасныя паказчыкі: на якой тэрыторыі фармаваўся кааператыўны саюз, колькі спажывецкіх таварыстваў уваходзіла ў яго склад, якая была колькасць яго членаў-пайшчыкаў, як выглядалі асноўныя фінансава-эканамічныя паказчыкі, наколькі эфектыўнай была арганізацыйна-кааперацыйная работа, а таксама шэраг іншых фактараў.

Звернемся да храналогіі падзей, звязаных з утварэннем кааператыўных саюзаў на тэрыторыі Беларусі ў яе этнічных межах. Першы ў Беларусі саюз "Гандлёва-прамысловае таварыства кааператараў Гомельскага раёна" ўзнік у 1915 г. У яго ўступіла 10 спажывецкіх таварыстваў. Быў устаноўлены паявы ўзнос у суме 60 р. Таварыства атрымала крэдыт Руска-Азіяцкага банка на суму 100 тыс. р.; акрамя таго, 13 тыс. р. – пазыкі прыватных асоб, 4,5 тыс. р. – з земскай касы. Такім чынам, агульная сума сродкаў, якая была ў распараджэнні Таварыства, склала 118 тыс. р. За 3,5 мес. яго абарот дасягнуў 71 тыс. р., чысты прыбытак – 2,2 тыс. р. Хаця фармальна было абрана праўленне Таварыства, фактычна яго справамі кіраваў земскі харчовы аддзел.

У 1916 г. утварыліся яшчэ тры саюзы: Сенненскі, Аршанскі і Магілёўскі. У тым жа годзе адбылося аб'яднанне спажывецкіх таварыстваў Віцебска. Такім чынам, саюзы спажывецкіх таварыстваў утварыліся амаль ва ўсіх беларускіх губернях, не занятых войскамі кайзераўскай Германіі. На Міншчыне да 1917 г. аб'яднанне спажывецкіх кааператываў у саюзы дакументальна не зафіксавана.

Як адзначаюць даследчыкі Л. М. Міхневіч, У. М. Басаў і інш., стыхійны рост кааператыўнага руху выклікаў незадаволенасць памешчыкаў, сельскай буржуазіі, гандляроў, якія бачылі ў кааперацыі сур'ёзнага канкурэнта. Пры знешне добразычлівым стаўленні да спажывецкіх кааператываў буржуазія, якая пракралася ў кааперацыю, усяляк імкнулася падпарадкаваць яе развіццё свайму ўплыву. Прадстаўнікі кіруючых колаў таксама імкнуліся ўзяць пад кантроль працэс кансалідацыі кааператываў у рэгіёнах і мець пры гэтым свае эканамічныя выгады. У Мінскай земскай управе быў створаны кааператыўны аддзел са штатам спецыяльных інструктараў. У Гомелі земства пасля працяглай барацьбы фактычна авалодала кіраваннем у кааператыўным саюзе. У Віцебску ў 1916 г. таксама была створана спецыяльная земская камісія па кааперацыі.

Як ішоў працэс фармавання Мінскага саюза кааператараў? Ці быў ён канкурэнтам саюза кааператараў Гомельшчыны, які ўзнік вясной 1915 г.? Ці магло Гандлёва-прамысловае таварыства кааператараў Гомельскага раёна прэтэндаваць на ролю агульнабеларускага цэнтра кааператыўнага руху? У артыкуле В. В. Кавальчука (пераклад аўтара) напісана наступнае: "У гады Першай сусветнай вайны становішча найбяднейшых пластоў насельніцтва значна пагоршылася. Нястрымны рост коштаў, інфляцыя, закрыццё прамысловых прадпрыемстваў, мабілізацыя ў войска большай часткі працаздольнага насельніцтва – усё гэта паставіла жыхароў

краіны на мяжу спусташэння і з'явілася заахвочвальным матывам да росту кааператыўнага руху. Не выпадкова толькі ў Гомельскім павеце ў 1915 г. дзейнічала ўжо 26 таварыстваў… Да гэтага часу спажывецкія таварыствы былі па сутнасці раз'яднаны. Частка кааператываў, якія функцыянавалі на Гомельшчыне, уваходзіла ў склад Маскоўскага саюза спажывецкіх таварыстваў, які адыгрываў у тыя гады ролю ўсерасійскага кааператыўнага цэнтра. Сярод іх Рэчыцкае таварыства, якое ўступіла ў гэты саюз у 1900 г., таварыства Гомельскіх чыгуначных майстэрняў (год уступлення 1909), Насовіцкае (1911 г.) – усё Гомельскага павета, Ленінскае таварыства Мазырскага павета, якое стала членам Маскоўскага саюза ў 1914 г. На тэрыторыі Беларускага краю такіх аб'яднанняў не было, першымі вырашылі стварыць саюз кааператары Гомельшчыны. На з'ездзе спажывецкай кааперацыі Гомельскага павета, які праходзіў 24–25 красавіка 1915 г., было створана Гандлёва-прамысловае таварыства кааператараў Гомельскага раёна. Больш за палову ўсіх кааператываў павета адразу ж уступіла ў аб'яднанне. Таварыству быў выдадзены крэдыт у аддзяленні Руска-Азіяцкага банка ў памеры 100 тыс. р., прыватныя асобы падалі 13 тыс. р. у выглядзе пазыкі, земская каса вылучыла 4,5 тыс. р. У першыя 3,5 мес. абарот таварыства склаў 71 тыс. р., чысты прыбытак – 2,2 тыс.» [10, с. 49]. Звернем увагу на аргумент В. В. Кавальчука на карысць таго, што першым на тэрыторыі Беларусі цэнтрам аб'яднання кааператараў стаў Гомель. Ён піша: «Хоць на тэрыторыі цяперашняй Беларусі неўзабаве пачалі з'яўляцца іншыя кааператыўныя аб'яднанні, Гомельскае таварыства і надалей заставалася самым буйным. На 1 студзеня 1917 г. у яго ўваходзіла 160 кааператываў Гомельскага павета, а таксама шэраг іншых з паветаў Магілёўскай губерні (да якой тады адносіўся і Гомельскі) і частка паветаў Мінскай і Чарнігаўскай губерняў» [10, с. 49].

У артыкуле В. В. Кавальчука адзначаецца, што Гомельскае таварыства развівалася хуткімі тэмпамі. Яно вяло закупкі тавараў па ўсёй Расіі і збывала іх праз разгалінаваную сетку сваіх крам. Так, завезены ў 1917 г. вагон алею адразу ж паступіў у продаж. Акрамя таго, таварыства займалася і іншымі відамі дзейнасці. Закуплялася гарбарная сыравіна, з якой вырабляўся шавецкі матэрыял. Кааператары Маркавіцкай воласці па ініцыятыве настаўніка Д. І. Кавалёва адкрылі на станцыі Церахаўка майстэрню па вытворчасці абаранкаў, выпякаючы за суткі каля 100 пудоў. Яны арандавалі крупадзёрку і закупленае зерне перапрацоўвалі ў крупы, якія рэалізоўвалі ў Гомелі. Таварыства таксама займалася закупкай сырых скур і вырабляла з іх шавецкі матэрыял. У таварыстве першымі ў Беларусі зразумелі неабходнасць кааператыўнай адукацыі і арганізавалі чытанне лекцый па рахункаводству, а ў 1917 г. там пачалі выпускаць газету "Кааператар", якая прапагандавала ідэі кааперацыі. Не засталася без увагі культурна-асветніцкая работа. Так, таварыства вёскі Глыбоцкае Гомельскага павета накіравала 5 тыс. р. для будаўніцтва народнай хаты як цэнтра гэтай працы. Такім чынам, Гомельскае гандлёва-прамысловае таварыства да 1917 г. уяўляла сабой самавітае прадпрыемства, абарачэнне якога за 1916 г. перавышала адзін мільён рублёў, значны па тых часах паказчык» [10, с. 50].

Вышэйапісаны фактычны матэрыял дае даволі поўную карціну ўніверсальнай дзейнасці гандлёва-прамысловага таварыства кааператараў Гомельшчыны ў 1915–1917 гг. З гэтага вынікае, што па размаху арганізацыйнай-кааператыўнай працы, колькасці кааператыўных таварыстваў, што ўдзельнічалі ў кааператыўных таварыствах, членаў-пайшчыкаў больш моцных кааператыўных саюзаў у дакастрычніцкі перыяд на беларускай зямлі не было.

Што вядома пра Саюз спажывецкіх таварыстваў Мінскага раёна, ад стварэння якога 22 чэрвеня 1917 г. адлічваецца гісторыя Белкаапсаюза?

Да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. на Міншчыне не было створаных саюзаў кааператараў. Аднак варта прызнаць, што Першая сусветная вайна, якая пачалася ў 1914 г., унесла значныя змены ў працэс кансалідацыі спажывецкіх таварыстваў у саюзы на беларускай зямлі, змяніла яго шлях. Беларусь стала арэнай ваенных дзеянняў. Лінія абароны Заходняга фронту, створаная ў 1915 г., падзяліла беларускі народ на дзве часткі на некалькі гадоў, унесла карэкціроўку ў працэс кааператыўнага будаўніцтва ў Беларусі.

У новых гістарычных умовах, звязаных з падзеямі Першай сусветнай вайны, прыблізна з 1917 г. Мінск становіцца цэнтрам аб'яднання беларускіх спажывецкіх кааператываў. У маі 1917 г., неўзабаве пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі і звяржэння расійскага самадзяржаўя, пры Мінскім губернскім земстве на аснове закона "Аб кааператыўных таварыствах і іх саюзах", прынятага 20 сакавіка 1917 г. Часовым урадам, быў створаны кааператыўны аддзел. Ён сутыкнуўся з задачай па ўпарадкаванню і арганізацыі працы кааператыўных арганізацый на тэрыторыі Мінскай губерні ва ўмовах ваеннага часу. Кааператыўным аддзелам земства было падрыхтавана скліканне агульнагубернскага кааператыўнага з'езда, які адбыўся ў Мінску

20–22 чэрвеня 2017 г. На з’ездзе было 82 дэлегаты, з якіх яўная большасць (49) прадстаўляла спажывецкую кааперацыю [2, с. 6].

22 чэрвеня 1917 г. удзельнікі першага Агульнагубернскага (арганізацыйнага) з’езда прадстаўнікоў кааператыўных таварыстваў прагаласавалі за стварэнне Саюза спажывецкіх таварыстваў Мінскага раёна, які заклаў аснову для стварэння ў будучым Белкаапсаюза. Зона дзейнасці Саюза ўключала ўсю Мінскую, частку Віленскай, Магілёўскай губерняў, Полацкі ўезд Віцебскай губерні. Кіруючымі органамі створанага Саюза спажывецкіх таварыстваў Мінскага раёна сталі Сход упаўнаважаных, Праўленне і Кантрольны савет. П. Т. Рудэнка быў абраны старшынёй Праўлення Саюза.

24 ліпеня 1918 г. па рашэнні Сходу ўпаўнаважаных спажывецкіх таварыстваў Саюз спажывецкіх таварыстваў Мінскага раёна быў перайменаваны ў Цэнтральны саюз спажывецкіх таварыстваў Беларускага краю (Цэнтрабелсаюз). Змена назвы звязана з вострай патрэбай Саюза ў атрыманні крэдытаў і неабходнасцю ўвайсці ў Цэнтральны саюз крэдытнай кааперацыі Беларускага краю, што было абавязковай умовай для перайменавання Саюза. Тэрыторыя Цэнтрабелсаюза, якая ахоплівала амаль увесь беларускі рэгіён, таксама значна пашырылася. На падставе рашэння Сходу ўпаўнаважаных Мінскі акруговы суд 19 верасня 1918 г. прыняў пастанову аб перайменаванні Саюза і яго рэгістрацыі пад новай назвай. К. Турчыновіч быў абраны Старшынёй Праўлення Саюза, а яго першым намеснікам стаў В. А. Пратас. З лістапада 1920 г. па верасень 1921 г. кіраўніком Цэнтрабелсаюза быў В. Бонк. На 1 студзеня 1919 г., да таго часу, калі нямецкая акупацыя тэрыторыі Беларусі была завершана, Цэнтрабелсаюз налічваў 156 кааператываў з 56 318 пайшчыкамі [1].

Аналіз найбольш важных падзей у гісторыі кааператыўнага руху на беларускай зямлі дазваляе нам зрабіць наступныя высновы. З красавіка 1915 г. да лета 1917 г. найбуйнейшым і самым уплывовым цэнтрам аб’яднання спажывецкіх кааператываў у Беларусі было Гандлёва-прамысловае таварыства кааператараў Гомельскага раёна. Пазіцыя ветэрана беларускай спажывецкай кааперацыі В. В. Кавальчука ў гэтай частцы цалкам апраўданая і бясспрэчная. Менавіта Гандлёва-прамысловае таварыства кааператараў Гомельскага раёна, створанае ў красавіку 1915 г., стала першым буйным рэгіянальным саюзам на этнічнай тэрыторыі Беларусі. Гэтая дата цалкам можа быць выкарыстана ў якасці першапачатковай падзеі ў гісторыі стварэння Белкаапсаюза. Станоўчым у такім выпадку была б ранейшая на два гады дата стварэння Белкаапсаюза.

Прынятая ў цяперашні час афіцыйная дата стварэння Саюза спажывецкіх таварыстваў Мінскага раёна (22 чэрвеня 1917 г.) як дзень “нараджэння” Белкаапсаюза таксама апраўдана і законна выкарыстоўваецца ў краіне. Менавіта Мінскі саюз быў перайменаваны ў Цэнтральны саюз спажывецкіх таварыстваў Беларускага краю (Цэнтрабелсаюз), кааператыўнае будаўніцтва на беларускай зямлі ў савецкі перыяд гісторыі разгарнулася вакол яго. Гэтыя падзеі разгарнуліся крыху пазней па часе.

Разгледжаныя факты пацвярджаюць толькі багаты вопыт кааператыўнага будаўніцтва ў Беларусі. Абедзве згаданыя даты і падзеі, звязаныя з імі, можна ўрачыста адзначаць у сучаснай Рэспубліцы Беларусь.

25 красавіка 2025 г. споўнілася 110 гадоў з моманту стварэння першага, найбуйнейшага ў дакастрычніцкі перыяд на беларускай зямлі Саюза кааператараў у Гомелі. Аўтары артыкула мяркуюць, што ў гонар гэтай памятнай даты было б мэтазгодна ўрачыста адкрыць на будынку Гомельскага абласнога спажывецкага таварыства па вуліцы Гагарына спецыяльную мемарыяльную дошку.

22 чэрвеня 2027 г. будзе 110 гадоў з часу стварэння Саюза спажывецкіх таварыстваў Мінскага раёна і Белкаапсаюза. Кааператары краіны ўжо пачалі падрыхтоўку да гэтай важнай даты. Святкаванне яе не замінае таму, каб падчас урачыстасцяў згадваць пра пачатак нацыянальнага саюзнага кааператыўнага будаўніцтва ў 1915 г. на Гомельшчыне.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. **Михневич, Л. М.** Торговля Белоруссии (1900–1970 гг.) / Л. М. Михневич. – Мн. : Наука и техника, 1973. – 224 с.

2. **Потребительская** кооперация Белорусской ССР / Г. З. Грищенков [и др.]. – Мн. : Ураджай, 1989. – 144 с.

3. **Аксёнов, А. Н.** Потребительские кооперативы Беларуси: зарождение и развитие / А. Н. Аксёнов // Потребительская кооперация. – 2016. – № 4. – С. 3–7.

4. **Аксёнов, А. Н.** Белкоопсоюз: становление и годы испытаний (1917–1921 годы) / А. Н. Аксёнов // Потребительская кооперация. – 2017. – № 1 (56). – С. 3–12.

5. **Басов, В. Н.** История потребительской кооперации Беларуси: события, факты, комментарии 1869–1941 гг. / В. Н. Басов. – Мн. : ГИВЦ Минсельхозпрода, 2010.

6. **Белкоопсоюз**: 100 лет заботы о людях = Belcoopsoyuz: 100 years of caring service / сост. В. В. Андриевич, В. Ф. Николайчук; авт. текста В. Ф. Николайчук; ред. совет: В. Н. Иванов, В. В. Андриевич, А. Н. Аксёнов [и др.]. – Мн. : Бел. энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2017. – 240 с.

7. **Сахарова, Д. Б.** История и теория кооперативного движения : учеб. пособие / Д. Б. Сахарова, И. С. Котов. – 2-е изд., испр. – Мн. : Новое знание, 2009.

8. **Сахарова, Д. Б.** Генезис и особенности развития потребительской кооперации Беларуси (вторая половина XIX века – 1917 год) / Д. Б. Сахарова // Потребительская кооперация. – 2012. – № 2 (37). – С. 16–21.

9. **Аксёнов, А. Н.** Становление и развитие белорусской потребкооперации: методологические аспекты и особенности исторических исследований / А. Н. Аксёнов // Эффективность сферы товарного обращения и труда : сб. науч. ст. IX Писаренков. чтений, г. Гомель, 26 окт. 2023 г. / редкол.: С. Н. Лебедева [и др.] ; под науч. ред. канд. экон. наук, доцента Т. В. Гасановой, канд. экон. наук, доцента А. З. Коробкина. – Гомель : Бел. торгово-экон. ун-т потреб. кооп., 2023. – С. 6–9. – 1 CD-ROM.

10. **Ковальчук, В. В.** Страницы истории потребительской кооперации Гомельской области / В. В. Ковальчук // Потребительская кооперация. – 2025. – № 3 (90). – С. 48–58.